2

Газэта рабоча-сялянскай моладзі Беларусі

Пролетары ўсіх краін, злучайцеся!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Ленінскага Камуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

№ 21 (403) Чацьвер, 17 лютага 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню: у аўторак, чацьвер, і суботу. | Год выд. VI. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. дню. Тэл. № 90? | Адрас Выдавецтва ЦК ЛКСМБ, «Чырвоная Зьмена», Менск, Комсам. 5.

НАША САМАЕ ЦЁПЛАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ ВАРТАЎНІКУ СССР—ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

МАТАР'ЯЛЫ ГЭТАГА НУМАРУ ПРЫСЬВЕЧАНЫ 9-ай ГАДАВІНЕ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

...РАЎНЕНЬНЕ НА ПРАКТЫЧНУЮ РАБОТУ!

Праз некалькі дзён—23 лютага—...паўняецца дзевяць гадоў з часу ...снаваньня Чырвонай Арміі.

Комсамол сумесна з працоўнымі ...авецкага Саюзу ужо пачаў падрых...оўку да таго, каб магчыма лепш ...дзначыць гэты гістарычны дзень.

З сёньняшнія дні ўдзел у той ... іншай рабоце адзначаецца ня тым ...ікам прыгожых слоў, якія гаворац...а, ня той цяжкасьцю вагі, якую ...аюць рассылаемые цыркуляры,—а ...ой практычнай работай, якая што...зённа выконваецца.

Чырвоная армія—гэта сталёвы ...артаўнік Савецкага Саюзу.

Чырвоная армія—працоўныя ў ...ынэлях—забясьпечваюць савецкія ...ежы ад капіталістычных драпежні...аў.

Рабочыя і сяляне—працоўныя з ...олатам і сярпом—павінны забясь...ечыць для Чырвонай арміі добра ...адрыхтаваны тыл.

У гэтым нумары (на трэцяй ...таронцы) мы друкуем цікавы ма...ар'ял аб тым, як ідзе вайсковая праца ў комсамольскіх ячэйках. Агульны вывад пры пераглядзе гэтых матар'ялаў такі, што ў цэлым гэта работа кульгае, ячэйкі ня ўдзяляюць ёй належнай ўвагі.

Нам патрэбна сто-процэнтная, поўная абароназдольнасьць усёй комсамольскай організацыі.

Увага да пытаньняў вайсковай працы патрэбна ня толькі ў той час, калі падыходзіць сьвята Чырвонай арміі.

Гэта ўвага павінна быць штодзённай, павінна рэхай адчувацца ўсіх галінах масавай саюзнай дзейнасьці. Лепшым падарункам для Чырвонай арміі, лепшай адзнакай памяці—будзе ўтварэньне шырокай сеткі вайсковых гурткоў і непасрэдны ўдзел працоўнай моладзі ў ТСА—Авіяхіме.

Набліжаецца сьвята Чырвонай арміі. Давайце-ж праверым, што намі зроблена ў справе ваенізацыі моладзі і вызначым у маштабе ячэйкі, раёну і акругі практычныя шляхі паляпшэньня, замацаваньня гэтай работы.

...Ажывім гурткі вайсковых ведаў

Ад размаўленьня „наогул"—за практычную працу!

Пры арганізацыі гурткоў ваенных ве...ў жадаючых занісацца звычайна бывае ...ога і на першых часах заняткі ідуць ...ыва. Аднак, часта, пасьля некалькіх за...ткаў цікавасьць да іх слабее, наведвань...е падае, гурток пачынае хварэць.

...Не пераліваць з пустога ў парожняе!

Звычайна, заняткі гуртка пачынаюц...з матар'яльнай часткі вінтоўкі і ас...ў балістыкі (навука аб законах пале...кулі ў паветры). Замест таго, каб у ...абходны час закончыць з гэтымі прад...тамі і перайсьці да другіх галін вайско...й справы, кіраўнік бясконца паўтараец...вызываючы ў гурткоўцаў натуральнае ...зачараваньне. Лепшы сродак пакон...ыць з такім «таптаньнем» гуртка на ...ным месцы—гэта перайсьці на вызна...ную програму заняткаў, чаго зараз ...шчэ ў большасьці гурткоў няма. На...упны важны недачот працы гурткоў ...айсковых ведаў зьяўляецца ў тым, што ... іх занятках у большай частцы быва...ць гутаркі і лекцыі. Практычна-ж за...ткі найбольш цікавыя і карысныя ...я гурткоўцаў ужываюцца рэдка. Таму ...ьмі многія з гурткоў зараз напамі...юць кепскую школу, дзе кіраўнік тлу...ачыць, а гурткоўцы слухаюць і адказ...юць.

Бліжэй да практыкі.

Каб пазбавіцца гэтага, гурткі павін...ы як можна часьцей ўжываць такія мэ...ды як выхады ў поле з задачамі на ...азьведку, ахова, паходны рух і інш. ...ашэньне тактычных задач на скрыцы ...з пяском: вайсковыя экскурсыі, экспэды...ыі і прагулкі з правядзеньнем у праця...у іх такіх заняткаў, як праца над кар...ю, орыентыраваньне на мясцовасьці, ...опаграфічная здымка абкружаючай мяс...овасьці, пераправа цераз рэчку, прась...ейшыя разьлікі на вайскова-інжынэрныя ...обудовы (напрыклад масты) і г. д.

Чаргуючы гэтыя практычныя заняткі ... тэорытычнай вучобай можна дабіцца, ...я толькі сталай цікавасьці да працы ...боку гурткоўцаў, але лепшага выву...эньня імі вайсковай справы, асяродак ...ажкасьці якое ляжыць ня ў тэорыі, а ... практыцы, гэта ёсьць у ПОЛІ.

Большасьць з гэтых практычных за...яткаў патрабуюць фармаваньня з гурт...оўцаў каманд разьведчыкаў, сувязі і ...айсковых падразьдзелаў (аддзяленьне, ...зор).

Вялікую дапамогу ў гэтай справе мо...а аказаць цесная сувязь грамадзянскага ...уртка вайсковых ведаў з вайсковай ячэй...ай ТСА—Авіяхіму, сябры якое чырво...аармейцы і малодшыя камандзіры могуць узяць на сябе пры правядзеньні палявых заняткаў ролю інструктароў.

Трэба вызначаць конкрэтныя задачы.

Перад практычнай працай гурткоўцаў можна паставіць якую небудзь вызначаную конкрэтную задачу, разьлічаную на тое, каб ад гэтай працы застаўся вызначаны вынік. Напрыклад, гурткоўцы могуць пабудаваць прасьцейшы вайсковы палявы гарадок, організаваць вайскова-галубіную станцыю, стварыць колекцыі топографічных здымкаў абкружаючай мясцовасьці інш.—навокал гэтай працы могуць аб'яднацца і некалькі суседніх гурткоў.

Вельмі важна як можна паўней скарыстаць у працы гуртка мэтод спаборніцтва, для якога вайсковая справа дае багатыя магчымасьці. Зараз, калі такія спаборніцтвы праводзяцца, дык толькі па стральбе. Паміж тым, можна і трэба праводзіць ня толькі стралковыя, але і тактычныя, топографічныя і іншыя спаборніцтвы. Іх можна організаваць, як ўнутры гуртка паміж гурткоўцамі, так і паміж некалькімі суседнімі гурткамі, для чаго адзін гурток можа вызваць другі. Прадметам такіх спаборніцтваў паміж гурткамі могуць служыць, акрамя стральбы, вокамернае вызначэньне адлегласьцяй, напісаньне «крокі» абкружаючай мясцовасьці, чытаньне плянаў і карт, рашэньне гурткамі тактычнай задачы аддзяленьня пры наступленьні і абароне, пераправа цераз рэчку і інш.

Адвядзём для вайсковай працы „дзень абароны".

Зараз гурткоўцы часта скардзяцца, «працуем, працуем і самі ня ведаем, чаго мы дасягнулі і чаго варты ў вайсковых адносінах». Для таго, каб сачыць за посьпехамі гурткоўцаў у вывучэньні вайсковых ведаў, добра завесьці спэцыяльную асабістую іспытацельную кніжку для адзнак аб праходжаньні заняткаў і выніках іспытаньняў. Як паказвае вопыт, многія з гурткоўцаў, якія прашлі такія іспыты нападаючы пры прызыве ў Чырвоную Армію высоўваліся ў шэрагі лепшых чырвонаармейцаў і хутка станавіліся малодшымі камандзірамі.

Зараз праца гурткоў вайсковых ведаў тармозіцца тым, што гурткоўцы занятыя другою грамадзкай і культурнай працай ня могуць рэгулярна наведваць заняткаў. Таму, ў мэтах ажыўленьня працы гурткоў ваенных ведаў пажадана адвесьці для вайсковай працы ў працягу тыдню ці двух тыдняў вызначаны дзень «дзень абароны»—вольны ад другой працы.

Д.

Заходнія суседзі падрыхтоўваюцца да вайны

Трэба быць уважлівымі каб захаваць мір

ВЫНІКІ ВАЕННАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СУСЕДЗЕЙ ВЫКЛІКАЮЦЬ ТРЫВОГУ

Баявая магутнасьць нашых заходніх суседзяў узрастае. Яны трацяць на ваенную падрыхтоўку многа сродкаў.

На адну душу насельніцтва прыходзіцца ваенных выдаткаў: у Фінляндыі 9 руб., у Эстоніі—9 руб. 40 кап., у Латвіі—9 руб., у Польшчы—9 р. 20 к., у Румыніі—5 р. 60 к., а у СССР—4 р. 20 к.

За апошні час узмацніліся

фашысцкія ваенныя саюзы.

Агульная лічба апошніх у Фінляндыі, Эстоніі, Латвіі і Польшчы разам узятых к канцу 1926 году павялічылася да 700.000 супроць 450.000 у 1925 годзе. Неабходна адзначыць, што гэтыя саюзы зьяўляюцца магутнаю організацыяй ўневайсковай падрыхтоўкі. Моладзь у іх часткова праходзіць дапрызыўную падрыхтоўку і запасныя атрымоўваюць далейшае ўдасканальваньне. Тут-жа адбываецца «выпрацоўка малодшага каманднага складу». У Фінскім шуцкары ўзяты курс на падрыхтоўку афіцэраў разэрву і шуцкара. Калі ўлічыць шматлікія арміі мірнага часу, уневайсковую і дапрызыўную падрыхтоўку ў фашысцкіх саюзах і ў навуковых установах, дык мы пабачым, што амаль усё насельніцтва, здольнае насіць зброю атрымоўвае вайсковую падрыхтоўку.

Такім чынам, вайсковая падрыхтоўка людзкіх запасаў амаль дасягнула сваіх межаў, за выключэньнем Фінляндыі, дзе неабучаны запас яшчэ значны, бо фіны пры царскім ражыму не праходзілі вайсковай службы.

Далейшае ўзмацненьне баявой магутнасьці нашых суседзяў ідзе і пойдзе па лініі паляпшэньня тэхнічных сродкаў барацьбы і падрыхтоўкі прамысловасьці да вайны.

У гэтых адносінах у першую чаргу трэба адзначыць

рост паветранага флёту.

Так, лік вайсковых самалётаў, якія знаходзяцца ў страю ва ўсіх Заходніх краінах разам узяты, павялічыўся ў 1926 годзе да 510 супроць 430 самалётаў у 1925 годзе. Колькасьць запасных самалётаў моцна ўрасла. Так, адна толькі Польшча ў працягу 1925-26 году заказала у Францыі каля 1000 самалётаў навейшых сыстэм. Эстонія таксама ў 1926 годзе пераўзброіла значную частку свайго паветранага флёту новымі самалётамі. За апошнія 3 гады лік вайсковых самалётаў (дзейнічаючых і знаходзячыхся ў мобзапасе) павялічыўся ў 3 з пал. разы.

За апошні час палепшылася ўзбройваньне арміі нашых суседзяў. Да гэтага часу на іх ўзбройваньні, былі самыя разнастойныя ўзоры зброі.

У працягу 1925 году і 1926 году, усе краіны імкнуліся ўвесьці ў сябе адзіныя ўзоры зброі.

Неабходна асабліва падкрэсьліць

„дасягненьні" Польшчы.

Апошняя к канцу 1926 году амаль поўнасьцю пераўзброіла сваю дывізыённую артылерыю 75 міліметравай французкай гарматай, якая зьяўляецца лепшай гарматай эўропэйскіх армій. Акрамя іншых вызначных якасьцяй, дальнасьць яе стральбы 11,2 кілёмэтраў супроць 8 кілёмэтраў нашай трохдзюймовай гарматы. Сваю гаўбічную і цяжкую артылерыю Польшча таксама імкнецца пераўзброіць французскімі абразцамі. Польшча, ня гледзячы на свае цяжкае экономічнае становішча, пашла на вялікія фінансавыя ахвяры з мэтаю мець у сябе артылерыю, якасьцю перавышаючую артылерыю Чырвонай арміі.

Іх ваенная прамысловасьць

у 1923 годзе пакрывала толькі 8—10 процантаў, а ў 1926 годзе ўжо 25—30 проц. запатрабаваньняў арміі ваеннага часу. За гэты пэрыод лік працуючых на ваенных заводах утроіўся. У 1927 годзе намечана далейшае разьвіцьцё ваеннай прамысловасьці (у асаблівасьці Польшчы і Румыніі).

Такім чынам, усе нашыя суседзі разам узятыя, вытворчасьцю свае ваеннай прамысловасьці ў сярэднім могуць пакрыць прыкладана 25-30 проц. боеприпасаў і зброі, патрэбнай у ваенны час. Астатнія 70-75 проц. павінны, будуць даstаўляцца з-за мяжы.

Бязумоўна,

вынікі падрыхтоўкі нашых суседзяў

за 1926 год ня могуць ня выклікаць у нас трывогі за захову міру на нашых Заходніх межах. Рост узбройваньня, узмацненьне баявой магутнасьці і зьвязаныя з імі звычайныя ваенныя выдаткі (усіх заходніх краін, разам узятых, складаюць каля 33-35 проц. усіх дзяржаўных выдаткаў) ня робяцца дарма. Можа наступіць момант, калі гарматы «самі» загавораць; гэта асабліва магчыма, калі прыняць пад увагу, што нашы суседзі ў многім зьяўляюцца слухмянаю зброяю ў руках аднаго з нашых найбольшых ворагаў—консэрватыўнай Ангельшчыны.

Трэба быць уважлівымі, каб захаваць мір на нашых межах, а Чырвоная армія павінна быць гатова забясьпечыць мірнае социялістычнае будаўніцтва ў нашым Саюзе.

Ж—р.



з галерэі нашых ворагаў.



„Вдохновитель" Польшчы.

Аршаншчына протэстуе.

Далёка чуваная крывавым дзеяньнем польская буржуазея на чале вядомага ката і прыгнятацеля працоўных мас Польшчы і Заходняй Беларусі — Пілсудзкага, ізноў пачынае таціць у крыві працоўнае прыгнечанае жыхарства Заходняй Беларусі.



1 з пол. тысячная Аршан. Ленінская комсамолія з фабрык і заводаў кідае свой магутны покліч протэсту супроць драпежных учынкаў паноў. Праз галавы драпежнікаў мы злучаемся з вамі гарапашныя пролетары Заходняй Беларусі адзінай думкай барацьбы з сусьветным капіталам.

Аршанская комсамолія заклікае ўсю рабочую моладзь, усіх працоўных прыйсьці на дапамогу рэволюцыянэрам і галадаючым ад недароду рабочым і сялянам Заходняй Беларусі!

Няхай жыве і шырыцца рух вызваленьня ў Заходняй Беларусі!

Прэч паганыя рукі ад працоўнай моладзі, ад усіх працоўных Заходняй Беларусі!

Няхай жыве Заходні комсамол — барацьбіт за волю!

АБ „ДНЮ АНГЕЛА", БАРАНЬНІХ ГАЛОВАХ І ГУРТКУ.

Маёнтак **Быкаўшчына**, што ў Ветрынскім раёне на Полаччыне славуты, як культурны цэнтр.

У ім ёсьць і дзіцячы гарадок, і школа і комсамольская ячэйка.

А ў комсамольскай ячэйцы ёсьць свой актыў, гэта агроном **Матусэвіч**, школьная працаўніца **Масюкова і Кузьмін**.

Вось гэты актыў і нясе на сваіх плячох усю цяжкую працу па культызацыі Быкаўскай моладзі і сялянства.

* * *

Сьцюдзена. Вецер гуляе па полі. Падымае пыркі сьнегу і круціць, замятае імі дарогі. Кідае жменькі сьнежнага пылу ў шыбы вакон. На дварэ цёмна, жудасна...

За тое ў гэты час дужа прыемна сядзець у цёплым пакойчыку, за сталом, пакрытым беласьнежным абрусам, з варчлівым самаварам на ім, гарой закусак, пры належнай кампаніі, ну і бязумоўна з... выпіўкай.

— Ох! якая асалода! За такі вечар здаецца аддаў-бы паўжыцьця—свавольна вырвалася з грудзей нашага актывістага Матусэвіча. І ён пачаў трымаць прамову:

— Мілыя мае госьці! я шчыра ўдзячан вам усім за ваша ўшанаваньне да мяне, што прышлі прывітаць мяне з «днём ангелу». Я знаю, што дзесьці цяпер мяне чакаюць... комсамольцы, каб разшавяліць свае бараньні галовы ў сельска-гаспадарчым гуртку, якім я кірую.

Я таксама ведаю, што і ў вас сягоньня шмат працы там з сялянамі на розных лікпунктах і сходах... фу, як гэта ўсе абрыдла! Але я ведаю, што вы разумееце мяне і спачуваеце, а таму сягоньня так добра правядзём свой вечар. Досыць працаваць толькі на людзей!...

І ў гэты час раптам ускочыў адзін з гасьцей—Кузьмін і трымаючы высака чарку ў руцэ голасна прарыпеў;

— Вып'ём-жа за здароў'е нашага глыбакапаважанага таварыша Матусэвіча і пажадаем-жа яму шчасьця й каханьня на многае лета! Ур-р-а!

...і усе пілі, пілі і сьмяяліся, Елі, курылі і «любезьнічалі». Усе «актывістыя» і агроном Матусэвіч, і настаўніца Масюкова, і Кузьмін, і яшчэ шмат гасьцей, як Цыцылія Міронаўна, Дар'я Сымонаўна, Мурашка і інш.

Толькі часам чуліся выкрыкі: — Досыць працаваць на людзей, трэба і на сябе паглядзець!

— ...Цыцылія Міронаўна, цалуйцеся калі ласка з Янкам Давыдавычам! такая-ж гульня...

І ліплі ў гэтым калаўроце разгулу рукі, грудзі, губы...

* * *

У клюбе комсамольцы сядзелі і чакалі кіраўніка Матусэвіча, каб пачаць заняткі. Частка нявытрымала і пашла дамоў, а частка, больш упартых, пашла шукаць яго...

Пастукалі ў кватэру Матусэвіча. Вышаў. Пытаюцца:

— Чаму ня прышоў на заняткі?

— Што? На заняткі! н-не м-магу! Сягоньня ў мяне «Дзень ангялу»

— Не, братка, гэта не па комсамольску!

— Н-ну р-раз так, дык п-пляваць мне і на заняткі і на вас,—выбуркнуў Матусэвіч і стукнуў дзьвярыма.

Пасталі комсамольцы, паморшчыліся ад абіды, паслухалі, як за вакном гармонь гарланіў, ліліся песьні, ды й пашлі...

* * *

Дужа працуюць нашы актывістыя. Шмат працы нясуць яны... І сялян навучаюць і комсамольцаў... І новы быт прасоўваюць у вёску.

А іх вучыць, дык і няма каму.

ЮРКА БАРАВЫ.

У Гамельчан маецца цікавы пачын

Яны організоўваюць вытворчыя лётарэі

За 8 месяцаў выпушчаюцца кваліфікаваныя рабочыя

Трэба з'арганізаваць брыгаду.

(Гомель, завод «Пролетары»).

Цяжка рабочай моладзі атрымаць кваліфікацыю ў такарным цэху нашага заводу. Майстры выкарыстоўваюць вучняў выключна на такой працы, якая выгадна ім.

На гэта маюцца і прычыны—галоўная з іх гэта тое, што майстры працуюць зьдзельна і зацікаўлены ў тым, каб як мага больш зрабіць.

Дзеля таго-ж каб паказаць што небудзь вучню—трэба траціць час, а майстры кажуць:

Час—гэта грошы!—і таму на вучнёўства не зьвяртаюць уцагі.

Каб пазбавіцца гэткага дрэннага становішча на мой погляд трэба ці з'арганізаваць брыгаду як гэта ўжо зроблена ў сьлясарна-мэханічным цэху, ці выплачваць компэнсацыю майстрам.

Юнкор.

Палепшым вучнёўства.

(Гомель, Шчацінная фабрыка „Чырвоны Кастрычнік“).

Усяго моладзі на нашай фабрыцы 45 чалавек. Вучнёўства пастаўлена як сьлед. У мінулым годзе была утворана брыгада, але яна сябе не апраўдала—бо вучань мог навучыцца толькі вузкай спэцыяльнасьці. А стане працаваць самастойна—партач...

Цяпер на фабрыцы у нас індывідуальнае вучнёўства. Уся фабрыка падзелена на невялічкія колектывы, і да кожнага такога колектыву прымацавана па некалькі вучняў. А затым кожнага вучня прымацоўваюць да асобнага майстра.

Кожны майстар зацікаўлены як бы лепш вывучыць свайго вучня, і нават паміж майстрамі конкурэнцыя існуе. Маюцца факты, калі частка з майстраў на працягу 7-8 месяцаў выпушчае зусім кваліфікаваных рабочых.

А прычына ўся у тым, што рабочыя працуюць колектыўна і майстар, які вучыць вучня ня церпіць убытку, а атрымоўвае толькі, кольькі і іншыя.

Вытворчая дысцыпліна на фабрыцы павысілася. Прагулаў з боку рабочых і моладзі не заўважаецца. На фабрыцы уведзены такі парадак—спазьніўся на 5 хвілін, рабочы да працы не дапускаецца.

Л.

„Браніраваны“ стары, ці 65-цігадовая бронь

У нас, у мястэчку Крупкі (Барысаўшчына) паўстала пытаньне аб правядзеньні броні у коопэратывы сельскагаспадарчага таварыства і таварыства спажыўцоў.

Загадчыкі магазынаў у сваю чаргу пачалі крычаць:—«**нам бронь ад комсамолу непатрэбна, мы такой броні не даверяем**».

І на грунце гэтага, загадчык коопэратыву таварыства спажыўцоў прыняў быў да сябе ў якасьці броні сваю пляменьніцу. Бязумоўна, ён ёй давяраў...

Але комсамол ня здаўся. «Пляменьніца» зьнята з працы. І што-ж вы думаеце? замест броні праўленьне таварыства спажыўцоў **па протэкцыі** старшыні таварыства Гладштэйна ўзяла **65-ці гадовага старыка,** вызначыўшы яму пэнсію 20 руб. у месяц. А ад броні адмаўляецца.

Мясцком саюзу Савгандслужачых хоць бачыць гэта, але чамусьці маўчыць.

М. Гурэвіч.

Беспрацоўных—у арцелі!

(Толочынскі р., Аршаншчына).

За апошні час у нас налічваецца каля 40 маладых беспрацоўных, з іх 8 у мястэчку. Акрамя гэтага ў хуткім часе скончыць сваю працу сязонны крахмальны завод. Гэта дасьць яшчэ 5 беспрацоўных з ліку моладзі.

У гэты-ж час на Азярэцкім лесзаводзе ў ліку броні маюцца перароcткі. Іх разбраніраваньне дасьць магчымасьць паслаць некалькі падлеткаў на працу ў заводзе.

У мэтах зьліквідаваньня беспрацоўя трэба экономкамісіі нашага райкомолу конкрэтна паставіць пытаньне перад профсаюзам Рабзямлес аб уцягненьні беспрацоўнага батрацтва у лесарубачныя арцелі.

Праз «Чырвоную Зьмену» мы ёй аб гэтым напамінаем. **Міхась Зак.**

Вытворчыя лётарэі.

(Гомель „Палесдрук“).

Кожнаму рабочаму неабходна быць у вядомай ступені падрыхтаваным і тэорытычна,—асабліва рабочаму «Палесдруку». На нашай фабрыцы гэта справа «храмае».

За апошні час мы ўзялі напрамак на правядзеньне шэрагу «вытворчых лётарэй».

Адзін, альбо два разы на тыдзень мы зьбіраем моладзь нашай фабрыкі, якая дае адказы на раней падрыхтаваныя запытаньні, якія датычуцца нашай прамысловасьці, як напрыклад:

— Як заключыць форму, каб у процэсе працы не зьяўляліся «мурашкі»?

— Як урэгуляваць фарбавы апарат? За лепшы адказ выдаем прэмію. Лётарэя вельмі зацікавіла моладзь. Яна патрабуе ад больш адсталых—падцягнуцца.

Лётарэя сябе ў нас спраўдзіла, радзім яе скарыстаць у працы і іншым вытворчым ячэйкам. **Кацовіч.**

Што паказалі перавыбары Саветаў

Мы навучыліся падрыхтоўвацца.

Задача комсамольскіх ячэек—сачыць за працаю сваіх сяброў у савета[х] і сваечасова выпраўляць іх памылкі.

Багацеі правялі заможніка Гурко.

Супроць гэтага протэстуе бедната.

(Вёска Ліхінічы, Круглянскі р., Аршаншчына).

У Ліхінічах у гэтым годзе, як і ў мінулыя гады перавыбары прашлі ня вел[ь]мі добра. Заўсёды па перавыбарчых сходах сяляне дзеляцца на дзьве часткі: з а[дн]нага боку—**комсамольцы і бедната**, з другога—**заможняя частка вёскі, с[а]магоншчыкі і інш. «падобныя людзі».**

Але ня гледзячы на організаванае выступленьне заможнай часткі вёскі, ка[н]дыдатуры, вызначаныя комсамольскай ячэйкай—комсамольцы тав. **Маляванаў** [і] **Балабуеў** прашлі абсолютнай большасьцю ў сябры сельсавету.

Багацеям патрабаваўся «свой» чалавек. Яны высунулі кандыдатуру **Яўхі[на] Гурко**. Ня гледзячы на выступленьне некаторых комсамольцаў супроць гэтай ка[н]дыдатуры—багацеі ўсё-ж правялі яго у сельсавет.

Комсамольцы, юнвяскоры і бедната абвясьцілі протэст супроць Гу[р]ко, ведаючы яго як абаронцу інтарэсаў заможніх.

Была напісана заява супроць Гурко ў Круглянскую выбарчую камісію, [дзе] падкрэсьлена **цэлы шэраг чорных спраў Гурко.** Гэта заява была падпісана у[сі]мі комсамольцамі, беднатой і іншымі сьвядомымі грамадзянамі вёскі.

Бедната і батракі чакаюць хутчэйшага вырашэньня гэтай справы, бо баяц[ца] каб Гурко зноў не ўкараніўся ў іх сельсавеце. **М. Ракушаў.**

Экзамен здалі добра.

(Чэрвеньскі раён, Менская акруга).

Перавыбары саветаў па нашаму раёну закончыліся ў канцы студзеня. Комсамольцаў выбрана ў сябры саветаў—27 чалавек. У кандыдаты—6 чал. і рэвізыйную камісію—5 чал. Процант комсамольцаў-сельсаветчыкаў у гэтым годзе, параўнаўча з мінулым годам, павялічыўся на 3 адзінкі.

У гэтым годзе комсамольцаў-старшынь сельсаветаў маем двух чалавек: намесьнікаў—3, сакратароў—6.

Перавыбары былі для організацыі экзаменам ў яе працы і трэба сказаць, што яна гэты экзамен вытрымала з посьпехам.

Неабходна адзначыць, што ў гэту перавыбарную кампанію ячэйкі і паасобныя комсамольцы адносіліся надзвычайна сур'ёзна да скліканьня належных нарад, с[хо]даў бедната, да падбору кандыдатур інш.

У спрэчках і выступленьнях адчу[ва]лася найбольшая актыўнасьць з бо[ку] **комсамольцаў, у асаблівасьці бе[ларускай] няцкай часткі організацыі.** Слабейш[ая] была актыўнасьць **дзяўчат і батрац[кай] моладзі.**

У агульным моладзь ішла з ячэйк[ай] комсамолу і выступала разам з імі.

Найвялікшая задача перад ячэйк[амі] і організацыяй у цэлым зараз хава[ецца] ў тым, каб устанавіць добры нагляд [за] працай новых дэпутатаў, сваечасова [рэ]агіраваць на недахопы, даваць умел[ае] правільнае кіраўніцтва.

У. Каласоўскі

Організавалі концэрт.

(Несяцкая яч. ЛКСМБ, Клічаўскага раёну, Бабруйскай акр.)

Напярэдадні перавыбараў кожнаму комсамольцу было добра растлумачана аб значэньні гэтай кампаніі і роля удзелу ў ёй ячэйкі.

Правялі дзень сялянскай моладзі ў вёсцы Турэц, дзе таксама было растлу[ма]чана аб перавыбарах.

Правялі сходы парабкоў усяго сел[ьса]вету і моладзі ў вёсцы Буднева і Нес[яць].

А ў час перавыбараў, каб пры[ця]нуць болей насельніцтва мы падрыхта[валі] концэртную частку: дэклямацыі, пе[сьні,] анэкдоты. Частку канцэрту давалі п[ерад] сходам, а другую—пасьля.

Зараз мы маем двух комсамол[ьцаў] сябрамі сельсавету, адзін з іх **намесь[нік] старшыні.**

Мота[...]

Ранейшых пам[ы]лак не паўтара[лі]

(Чашніцкі раён, Віцебшчын[а])

Вопыт мінулых перавыбараў і уд[зел] ў іх комсамольскіх ячэек выявіў н[...] недахопаў.

У гэтым годзе нашы ячэйкі пад[ыйшлі] да гэтага пытаньня больш сумленна [чым] у мінулым годзе.

Ад райкому КСМ загадзе было да[дзена] наказаньне і ячэйкі іх выканалі пры[блізна] на ўсе 100 проц. Сходы беднаты [пра]ведваліся комсамольцамі, дзе яны акт[ыўна] абгаварвалі кандыдатуры, прыслухоў[ва]чыся да голасу беднаты.

Комсамольцы да дню перавыб[араў] разьвесілі лёзунгі-плякаты аб пера[выба]рах, а таксама і **хадзілі па ха[тах] запрашаць на перавыбары.**

Праўда, у некаторых ячэйках [была] пасыўнасьць, асабліва ў Дварэцкай і [...]чаўскай. Але ў агульным выніке [...] значныя: абрана у склад сельса[вета] 28 комсамольцаў. З іх—**2 саката[ры і] 3 старшыні сельсавету.** Комса[молец] Чашніцкай ячэйкі т. Герман ужо [...] год абіраецца ў старшыні, як добра [па]казаўшы сябе у працы і заваява[ўшы] аўторытэт сярод беднякоў.

Удзел комсамольскіх ячэек у пе[равы]барах сёлетняга году прашоў больш [...] і лепш [...] мінулых перавыбарах.

Сымон Імшар[...]

ВЕДАЙ ГІСТОРЫЮ СЛАЎНАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ!

Пачынайце падрыхтоўку да дзевятай гадавіны Чырвонай арміі.

(Матар'ялы ў дапамогу дакладчыкам).

—Сьвяткаваньне гадавіны Чырвонай Арміі зьяўляецца успамінамі аб яе гэроічных перамогах і вялікіх заслугах перад Кастрычнікавай рэволюцыяй і сусьветным пролетарыятам.

Нашыя міжнародныя абставіны

— Сёньняшнія міжнародныя абставіны вызначаюцца абвастрэньнем супярэчнасьцяў ня толькі ў адносінах буржуазных краін з Саюзам Савецкіх Рэспублік, але і ў адносінах асобных груп імпэрыялістычных дзяржаў паміж сабою. Побач з гэтым абвастраюцца клясавыя супярэчнасьці унутры капіталістычных краін, расьце вызвалены рух каленіяльных і паўкалёніяльных краінах (Кітай, Індонэзія), прыкметна лавеюць рабочыя масы (забастоўка ангельскіх вуглякопаў, рэфэрэндум Нямеччыне і інш.) і расьце аўтарытэт з СССР і сымпатыі да яго ўсяго сьвету.

— Ростам і абвастрэньнем адзначаных супярэчнасьцяў умоўліваецца хуткі рост узброеньня у капіталістычных краінах і разьвіцьцё ваеннай тэхнікі. Вайсковы бюджэт буйнейшых капіталістычных краін ўзрос на 80 процантаў параўнаўча з 1913 годам, колькасьць іх кадравых армій павялічылася амаль на 200.000 чалавек, а пры вучоце усіх захаваных узброеных сіл—амаль удвое. Гэтыя факты знаходзяцца ў поўнай супярэчнасьці з размовамі імпэрыялістых аб разбройваньні і сьведчаць аб тым, што ўсе нарады лігі-нацый і розныя спэцыяльныя конфэрэнцыі па разбройваньню «абазначаюць сапраўды нішто іншае, як растаноўка сіл для новай вайны» (14-ты зьезд партыі).

— Асаблівую ўвагу працоўных СССР і ўсяго сьвету заслугоўвае палітыка Англіі ў адносінах да СССР. Разбураны ў сваіх асновах забастоўкаю вуглякопаў і магутным нацыянальным рэволюцыйным рухам у Кітаі, ангельскі імпэрыялізм накіроўвае ўсе свае сілы на падрыхтоўку інтэрвэнцыі ў СССР, у якой яна бачыць асноўнага віноўніка рэволюцыйнага руху. План абкружэньня СССР колам варожых краін настойліва і не бяз посьпехаў праводзіцца. Пераварот Пілсудзкага ў Польшчы зрабіўся на простаму загаду Англіі; фашысцкі пераварот у Літве таксама не абышоўся бяз удзелу Англіі. Перамога фашызму у Літве служыць сыгналам да фашысцкага перавароту і ў другіх прыбалтыцкіх краінах (спроба фашысцкага перавароту ў Латвіі). Дзякуючы актыўнай падтрымцы Англіі і другіх буйнейшых капіталістычных краін нашыя пагранічныя суседзі за апошнія 3 гады павялічылі свой вайсковы бюджэт на 16 проц., у лік кадравай арміі—на 11,3 проц. і стварылі значныя схованыя ўзброеныя сілы. Ажывілася і белагвардзейшчына ўсіх рознакаляёрнасьцяў і занялася энэргічнаю падрыхтоўчаю працаю.

Мы дамагаемся міру.

Адсюль нямінуча выцякае неабходнасьць сур'ёзнай падрыхтоўкі СССР да абароны. Рабоча-сялянскі ўрад усімі патугамі дабіваецца міру. УсеКП(б)—правадыр Чырвонай Арміі і ўсіх працоўных—на сваім 14-м зьезьдзе даў рашучую дырэктыву «вясьці політыку міру», якая знашла свой адбітак у шэрагу ўжо заключаных дагавораў з асобнымі дзяржавамі (Нямеччына, Турэччына і Літва) і ў прапановах нашага ўраду аб заключэньні дагавароў з другімі дзяржавамі (Польшча, Фінляндыя і інш.). Але ведаючы няпрымірымасьць нашых ворагаў, мы прымушаны «прымаць усе захады па ўзмацненьню абароназдольнасьці краіны і ўзмацненьня магутнасьці Чырвонай Арміі і Чырвонага Флёту, марскога і паветранага» (14-ты зьезд партыі).

— 3-ці зьезд саветаў СССР удаканаліў тыя задачы, якія неабходна разьвязаць у сувязі з падрыхтоўкаю краіны да абароны. У асноўным, гэтыя задачы зводзяцца да ўзмацненьня Чырвонай Арміі, пашырэньня вайсковай прамысловасьці і падрыхтоўкі грамадзянскай прамысловасьці да патрэб ваеннага часу, разьвіцьцю вайсковай тэхнікі, галоўным чынам, авіяцыі і хэміі, і вайсковай падрыхтоўцы ўсяго працоўнага насельніцтва, якое стане нямінуча ўдзельнікам вайны.

— Ажыцьцяўляючы політыку міру і імкнучыся паменшыць вайсковыя цяжкасьці насельніцтва, сталая Чырвоная Армія зьменшана да 562 тысяч чалавек. Шляхам унутранай рэорганізацыі створаны больш чоткія і ўстойлівыя організацыйныя формы, палепшылася пастаноўка вучэбнай працы, вырасла політычная сьвядомасьць чырвонаармейцаў; узмацнілася дысцыпліна, палепшылася матар'яльнае становішча чырвонаармейцаў і начскладу, значна павысіліся тэхнічныя сродкі барацьбы у Чырвонай Арміі. Такім чынам зьмяншэньне колькасьці не адбілася на бояздольнасьці Чырвонай Арміі. Тав. Варашылаў на апошняй Маскоўскай партыйнай конфэрэнцыі з поўным правам мог заявіць: «Нашы ўзброеныя сілы не адставалі ад росту ўсяе нашай краіны. Мы да абароны межаў саюзу падрыхтаваны ў кожную дадзеную хвіліну».

Побач з кадравай існуе міліцыйная

—Не аднаю кадраваю арміяй вызначаюцца баявыя сілы СССР. Побач з скарачэньнем сталай арміі створана тэрыторыяльна-міліцыйная сыстэма фармаваньня ўзброеных сіл краіны. Навокал невялікага кадравага складу ўкомплектоўваюцца па раёнах (тэрыторыі) адпаведныя часткі з працоўных, з такім разьлікам, «каб жывая чалавечая сіла вызначаных гаспадарчых раёнаў зьяўлялася ў той-жа час жывою чалавечаю сілаю вызначанай вайсковай часткі» (9-ты зьезд партыі). Ад свае вытворчай працы працоўныя атрываюцца на кароткі час для вайсковага абучэньня. Пры першай мобілізацыі грамадзяне ператвараюцца ў организацыйназьяднаную бояздольную армію нараўне з кадравымі часткамі.

Аднак, тэрыторыяльна-міліцыйная сыстэма пры скарочаным навучаньні (2-12м. у працягу 5 гадоў) можа даць добра навучанага байца пры ўмовах актыўнага садзейнічаньня ўсяго грамадзянскага насельніцтва правядзеньню збораў і шырокай організацыі адпаведнай працы грамадзянскіх політыка-асьветных організацый з пераменьнікамі паміж зборамі (па вайсковаму і політычнаму выхаваньню).

Ваенізуем тыл!

Грамадзкая думка ужо створана, шырокія колы рабочых і сялян паступова асазнаюць неабходнасьць вайсковай граматнасьці, цясьнейшага зьбліжэньня і моцнай спайкі з Чырвонай Арміяй, расьце сетка вайсковых куткоў і гурткоў вайсковых ведаў у грамадзянскіх клубах і хатахчытальнях. Прызнаваючы, што гэтыя першыя посьпехі зусім навочны, трэба дабівацца большай актыўнасьці, большага абхвату ўсяго працоўнага насельніцтва (удзелу ў об-ве садзейнічаньня абароны і авіяцыйнай і хэмічнай прамысловасьці краіны—«ТСА-Авіяхім», праца па вайсковых кутках і гуртках вайсковых ведаў і інш.). Актыўны і сьвядомы удзел рабочых і сялян у будаўніцтве абароны СССР—залог таго, што ў выпадку вайны навокал партыі разам з Чырвонай Арміяй зьяднаецца увесь узброены народ, абараняючы сваю мірную працу.

Сур'ёзная і цяжкая задача па ўзмацненьню абароназдольнасьці нашай краіны ня можа быць разьвязана адным толькі ваеным ведамствам, а патрабуецца ўдзел у роўнай ступені усіх грамадзянскіх і партыйных, профэсыйных і грамадзкіх організацый.

У сучасны момант падрыхтоўка «тылу» да абароны набывае зусім выключнае значэньне, гэта павінен ведаць кожны рабочы і селянін.

Пры першай спробе да нападу з Чырвонаю арміяй павінны зьяднацца ўсе у адзіную магутную сілу, усе працоўныя, аб'яднаныя беззаветнаю адданасьцю Савецкай уладзе і Ленінскай партыі.

Палепшым вайсковую працу комсамольскіх ячэек!

(Нарада пры рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“, сумесна з прадстаўнікамі ячэек, грамадзкіх організацый і вайсковых камісій).

Вайсковая праца ледзь-ледзь адчуваецца.--Неабходзен значны штуршок.

Некаторыя ячэйкі лічаць неабходным для посьпеху вайсковай працы мець чуць не кулямёты, забываючы стварыць вайсковы гурток.

— Да гэтага часу мы кепска дзяліліся вопытам працы па ваенізацыі на старонках нашага друку.

Вось таму мы і склікалі гэтую нараду, каб выявіць вопыт працы комсамольскіх ячэек на ваенізацыі, заслухаць конкрэтныя прапановы спэцыялістых--вайсковых і на аснове гэтых матар'ялаў даць магчымасьць нашым ячэйкам паставіць працу па ваенізацыі на належную вышыню! З гэткім уступным словам зьвярнуўся да прысутных **т. Барашка,** адчыніўшы нараду ад імя рэдакцыі «**Чырвонай Зьмены**».

„Яшчэ добра неўразумелі значэньня ваенізацыі“.

Ці магчыма дзяўчатам прымаць удзел у вайсковай працы.—Прадстаўнік ячэйкі саюзу нарпіт кажа: «не, не магчыма.» — А мы кажам: безумоўна магчыма.—У вайсковым гуртку мала комсамольцаў.

Тав. Мальбін. — (Яч. саюзу нарпіт). Вайсковай працы ў нашай ячэйцы перашкаджаець тое, што ў яе складзе большасьць дзяўчат, якіх ні ў якім разе нельга ваенізаваць. шмат хатніх работніц, якія маюць вельмі мала вольнага часу і наогул перагружанасьць грамадзкай працай усёй ячэйкі. Акрамя гэтага на нашай вайсковай працы адбілася частая зьмена прымацаваных да нас вайсковых комсамольскіх груп.

У вайсковым гуртку займаецца комсамольцаў каля 4 проц. усёй ячэйкі. Шкада, што зусім няма комсамольцамў сяброў Авіяхіму--ТСА, хоць пытаньне аб гэтым ставілася некалькі разоў.

У гуртках фізычнай культуры займаецца каля 30 комсамольцаў. З-за адсутнасьці памяшканьня--няма вайсковага гуртку.

Вучоту працы вайсковага гуртку няма яшчэ, бо ён недаўна пачаў працаваць. Вывучаюць цяпер у гуртку стралковую справу. На сходах ячэйкі два разы ставілі даклады аб ваенізацыі. Адзін раз быў заслуханы даклад сатаварыскай вайсковай групы аб яе працы.

Асабліва цеснай сувязі з сатаварыскай групай яшчэ няма, з прычыны таго, што яны часта зьмяняліся. Некалькі раз мы правялі экскурсіі ў казарму.

Нашы комсамольцы яшчэ добра не уразумелі ўсяго значэньня ваенізацыі.

Літаратуры мы ня купляем, бо ня маем грошаў. Клюб выпісвае адну часопісь «Военный вестник» і адну вайсковую газэту.

У двух мясцкомах ёсьць два вайсковыя куткі.

прыстасаваць да умоў вытворчасьці той ці іншай ячэйкі, бо ў нас у выпадку вайны частка прадпрыемств будзе мілітарызавана.

Для абсталяваньня больш-менш падыходзячага ціру, трэба затраціць усяго каля 10 рублёў.

На кожным прадпрыемстве заўсёды ёсьць 3-4 камандзіры запасу іх можна скарыстаць больш усяго.

Для дзяўчат--вайскова-санітарны гурток.

Тав. Капралаў (які абсьледваў ячэйку тэкстыльшчыкаў, дакладчык на нараду спазьніўся).

—У ячэйцы—80 проц. дзяўчат. У вайсковых гуртках займаецца каля 30 чалавек. Для дзяўчат у апошнія дні ўтвораны вайскова-санітарны гурток.

Ёсьць таксама ячэйка ТСА, якая яшчэ пакуль што не афармлена. Праца ў гуртках вядзецца шляхам гутарак.

Дасягненьнямі ў гэтай ячэйцы я лічу, зацікаўленасьць стралковай справай, здавальняючае пападаньне зьменшаным зарадам. К недахопам трэба аднесьці недастатковую сувязь з сатаварыскай вайсковай групай. Плян вайсковай працы на 80 проц. ня выканан. Прадстаўніцтва да вайсковай часткі здавальняючае. Зусім недастаткова пропаганда вайсковай справы. Усё-ж такі большасьць комсамольцаў азнаёмлена з відамі ґазаў з праціваґазам, амаль што кожны прабываў у праціваґазе.

Ажыўленьне у заняткі вайсковага гуртка ўносяць дапрызыўнікі, якія ўваходзяць у гэтыя гурткі.

Вядзецца вучот гуртка вайсковай працы. Дапамога з боку вайсковых ня зусім дастаткова, былі 2 наведваньні ў казармы. Добрым зьявішчам я лічу, тое што на дэмонстрацыях былі выпадкі, калі таварышы, якія займаюцца ў вайсковых гуртках, гуртаваліся асобна і ішлі ўперадзе калёны. Літаратуру скарыстоўваюць з дому «Чырвонай арміі».

Вынікі: ячэйка павінна больш зьвязацца з сатаварыскай вайсковай групай разгарнуць больш шырока пропагандыскую працу па ваенізацыі.

Мы будзем абароназдольны.

... Калі за кадравай Чырвонай арміяй

... Мы будзем мець моцны тыл.

Патроху... нічога ня робім.

(Ячэйка ФЗВ гарбароў. Дакладчык т. Мялік).

Раней была хімкаманда, цяпер яна распушчана.- Аддаліся вучобе. Запамяталі аб ваенізацыі.—Патрэбен вайсковы гурток.

—Наша ячэйка ў галіне вайсковай працы асаблівай прыкладнасьцю не адзначалася. У ячэйцы каля 35 проц. комсамольцаў цікавяцца вайсковай працай, займаюцца ў гуртках Авіяхэму, у ячэйцы 5 дзяўчат, астатнія—дапрызыўнікі. У спортгуртку займаецца—15 чалавек. Раней існавала у нас пры ўсіх скураных заводах хімічная каманда, цяпер яна распушчана. Некаторыя цікавяцца цірамі і наведваюць. Прычыны слабасьці вайсковай працы тым, што хлапцы аддаліся вучобе, акрамя таго многім перашкаджаюць вячэрнія заняткі.

Няма ў нас таксама, добрай пастаноў масавай працы ячэйкі Авіяхэму, якая, акрамя 2-х дакладаў улетку, больш нічога не зрабіла. У вёсцы нам удалося організаваць вайсковы гурток, забясьпечыць яго літаратурай.

Садаклад тав. Зарэцкага.— Ячэйка налічвае 45 чал. з іх 12 дапрызыўнікаў. **Праца па ваенізацыі ў ячэйцы не вядзецца**. Праца прадстаўніка вайсковай часткі не праўляраецца. У хлапцоў ёсьць зацікаўленасьць хэмічнымі ведамі, ячэйка не паклапацілася гэтую зацікаўленасьць здаволіць. Я лічу, што організацыя вайсковага кутка ў іх зьвязана з шэрагам цяжкасьцяй, наўрад яны знойдуць для гэтага памяшканьне. Але вайсковы гурток утварыць магчыма і неабходна.

„Рукамі не чапаць“.

Праца вайсковага гуртка клюбу „КІМ“.

Кіраўнікоў мяняюць, як рукавіцы.—Пажадана, каб быў цір.—Хлапцы жадаюць «ахапіць неахапімае».

Тав. Зарэцкі (Вайсковы гурток клюбу «КІМ»).-На працы ў нашым гуртку значна адбілася частая зьмена кіраўніцтву. За год у нас зьмянілі 6 кіраўнікоў. Хлапцы нашы праводзілі экскурсіі да вайсковых, удзельнічалі ў цірах, атрымалі добры прызы. Займаюцца ў нашым гуртку выключна комсамольцы, але ня ўсе з запісаўшыхся прымаюць удзел у працы. З масавай працы мы правялі ў клюбе адзін паказальны вайсковы вечар. Адбіваецца на працы гуртка—малая колькасьць вайсковай літаратуры.

Тав. Калікахан (кіраўнік гуртка клюбу «КІМ»).—Я ў гуртку працую нядаўна, але заўважыў добрую зацікаўленасьць хлопцаў в а й с к о в ы м і ведамі. Вось калі я пачаў працу у гуртку, там было—30 чалавек, цяпер ужо—50. Наведваньне гуртка добрае. Назіраецца з боку хлопцаў імкненьне ахапіць ўсе вайсковыя веды поўнасьцю. Па лыжнаму спорту, мы правялі 2 заняткі. Вельмі пажадана мець пры клюбе цір, адсутнасьць яго адчуваецца на нашай працы, якая пагэтаму ня можа даць добрых вынікаў.

Тав. Шмідоў (АБВШ)—Нашы комсамольцы не скарыстоўваюць як належыць вайсковыя часткі для сваёй практычнай працы. Тут казалі пра клюб «КІМ», я там быў. Заўважыў я там абвестку прымацованую у вайсковым кутку «Рукамі не чапаць» Гэта не гадзіцца. Карысьці з гэтага ніякай ня будзе, калі кожны прышоўшы комсамолец, ня будзе мець магчымасьці ўзяць вінтоўку, разьняць яе і г. д. Экскурсіі у казармы праходзяць казённа, яны зусім не падрыхтоўваюцца і не скарыстоўваюцца для практычнай працы.

Цір ёсьць пры доме «Чырвонай арміі», але гэта недастаткова. Маленькія ціры можна і неабходна абсталяваць пры кожным клюбе.

Ажывіць Авіяхім!

Тав. Зэйфман (Ляхаўскі райком). —Ячэйкі Авіяхіму нічога ня робяць. Ёсьць апарат Акруговага Камітэту Авіяхіму і больш нічога.

Масавай працы. дапамогі асобным ячэйкам ня было.

Нам трэба за справу ваенізацыі ўзяцца больш конкрэтна. Авіяхім павінен стаць зачыншчыкам у гэтым. Комсамольскія ячэйкі акажуць яму шырокую падтрымку.

Тав. Міцкевіч (АБВШ). Хоць шмат якія ячэйкі разьвесілі на сьценах вінтоўку, дыяграмы, пляны і г. д., а карысьці яны ніякай не даюць.

Зацікаўленасьць вайсковай працы не ўхапілі нашыя вярхі, ні бюро ячэек, ні нават райкомы (як казалі аб адным райкоме).

Выкарыстаем магчымасьці.

Тав. Зайцаў. (Таварыства Садзейнічаньня Абароне)-Як відаць са спрэчак справа ўсё ж такі абстаіць ня зусім так кепска. Мы зараз знаходзімся ў пэрыодзе падрыхтоўкі да абароны ўсяго насельніцтва.

Наша задача—стварыць шырокую грамадзкасьць, якая-б забясьпечыла сымпатыі насельніцтва да праваўдзімых вайсковых опэрацый. У гэтых адносінах намі зроблена злачынна мала, значна менш, чым напрыклад, зроблена ў нашай суседкі Польшчы.

Неабходна вайсковую падрыхтоўку

Ваенізацыя гэта не сатаварыства

Тав. Хонік. Нашы комсамольскія ячэйкі блытаюць вельмі часта ваенізацыю з працай па сатаварыству. Трэба скарыстоўваць больш насьценгазэту для справы ваенізацыі, адводзячы ў ёй асобны вайсковы куток. Многія ячэйкі лічаць сваім дасягненьнем дапрызападрыхтоўку, але паклапаціцца аб тым каб замацаваць веды, якія дапрызыўнікі атрымалі на пункце, —гэтага няма.

„Дайце нам... кулямёт!“

Тав. Субердзянаў.— На сёнешняй нарадзе выступаючыя грамадзянскія комсамольцы кроюць вайсковых і наадварот. Вайсковых газэт, часопісяй амаль што ні адна ячэйка ня выпісвае. Зацікаўленасьці з боку комсамольскіх ячэяк мала. Кажуць аб цяжкасьцях організацыі вайсковага кутка. Я лічу, што выпісаць аднэй газэты і аднэй часопісі хопіць каб утварыць вайсковы куток. Комсамольцы павінны больш часта наведваць нашы чырвонаармейскія казармы. Там яны знойдуць ўсе магчымасьці для атрыманьня вайсковых ведаў. А часта комсамольцы прыходзяць да нас, у вайсковую частку і для кутка просяць даць кулямёт, пікі, вінтоўкі. Гэтак не гадзіцца. Выходзіць, што калі пачнецца вайна, мы будзем хадзіць па кутках і зьбіраць нашы вайсковыя прылады. Дзяўчаты часам прыходзяць к нам у казарму патанцаваць а не атрымаць вайсковыя веды.

Ваенізаваць і піонэраў.

Тав. Богін (яч-ка Электростанцыі). У нас комсамольцы аднекуль дасталі затвор, дасталі заржавелую вінтоўку, самі справілі яе ў нашых майстэрнях і цяпер ёю карыстаюцца. Дапрызыўнікі, трэба сказаць далі вялікі штурхач вайсковай працы ў нашых ячэйках. Ваенізацыю трэба пачынаць ня толькі з комсамольскага уаросту але і з піонэрскага. У нас некаторыя піонэры закупілі сябе «Моетэ Крысто», зьбіраюцца ў сябе дома і там практыкуюцца ў стральбе яны-ж зрабілі модэлі бранявіка і пушкі. Піонэрамі абсталяван вайсковы куток. Гутаркі на зьвеньнях таксама часта маюць вайсковы зьмест.

„Вярхі“ незацікаўлены, дык што і казаць

Тав. Балжэнка.—Калі вайсковай справай не зацікаўлены нашы «вярхі», дык чаго нам чакаць ад нізоў. Я прысутнічаў на АПА гарадзкога Райкому, дзе складалі плян вайсковай працы, і што-ж, —намецілі правесьці 2 вечары пропаганды, практыкаваць экскурсіі і г. д., а аб ваенізацыі ні слова.

Юнсэкцыі клюбаў не працуюць як належыць быць, вось у клюбе харчаўнікоў бюро юнсэкцыі ні разу не паклапацілася паглядзець, як працуе вайсковы гурток.

Працы--шмат, патрэбна--упартасьць!

Тав. Язьвінскі (Авіяхім).—З замежнай літаратуры відаць, што у будучай вайне будуць ў значнай меры ужывацца атрутваючыя матэрыіі. Ужываньне гэтай матэрыі зьвішчыць розьніцу паміж тылам і фронтам і ў значнай меры будзе пагражаць мірнаму насельніцтву гарадоў і іншых буйных цэнтраў. Таму не паслабляючы разьвіцьця стралковага спорту, сатаварыства вайсковых гурткоў, комсамольцам неабходна дапамагчы Авіяхіму ў правядзеньні працы па падрыхтоўцы насельніцтва да паветрана-хэмічнай абароны і ажыцьцяўленьні працы авіяхімкаманд.

У працу па ваенізацыі комсамолу мы павінны ўзяць два курсы. Першае—гэта праца па ваенізацыі той часткі моладзі, якая пойдзе ў армію. І другое—праца па ваенізацыі тых, якія застануцца на мясцох. У працу авіяхімкаманд трэба ўцягваць комсамолак, бо яны ў большасьці застануцца ў гарадох і змогуць праводзіць газаабарону. Вайсковаму комсамолу неабходна прыняць актыўны ўдзел у пастах назіраньня. Піонэрам можна даручыць галубіны спорт, разьвядзеньне і прывучваньне паштовых галубоў. У часе вайсковых опэрацый яны змогуць прынесьці вялікую карысьць. І апошняе, на што я хачу зьвараціць увагу комсамолу гэта на высоўваньне моладзі ў авіалётныя школы. Процант комсамольцаў паступаючых ў гэтыя школы яшчэ вельмі малы.

Ад прамоў--да працы

Тав. Рубін (Менакругком).—Сёньняшняя нарада паказала, што нашы ячэйкі маюць шэраг дасягненьняў. Грамадзкія ячэйкі пачалі працу, зацікавіліся ёю, жадаюць яе паставіць на належную вышыню, але шэраг фактаў кажуць аб тым, што вайсковыя таварышы ад працы адмаўляюцца.

У справе ваенізацыі трэба ад агульных размоў перайсьці да конкрэтнай справы.

Ратнэр (вайсковая камісія ЦК ЛКСМБ). З боку ЦК АК РК і бюро ячэек былі кепскія адносіны да працы па ваенізацыі ў нашых ячэйках.

Нам цяпер неабходна ўпчыльную падайсьці да працы па ваенізацыі, больш уважліва паставіць праверку і вучот гэтай працы і ў АК і ў Райкомах.

Ячэйкі ТСА--Авіяхім, сатаварыскія вайсковыя групы часам не працуюць добра, нам трэба іх ня лаяць, а праявіць у гэтых адносінах ініцыятыву і дабіцца каб праца ў гэтых галінах прасунулася ўперад.

Заслугоўвае ўвагі прапанова тав. Зайцава аб прыстасаваньні вайсковай працы да вытворчасьці той ці іншай ячэйкі.

Масавая праца: нашы юнсэкцыі павінны больш рабіць чым да гэтага часу. Вечары спаборніцтва, вайсковыя гульні, даклады па вайскова-тэхнічным пытаньням, павінны заняць большае месца ў працы нашых юнсэкцый.

Пры ВСФК утворана стралковая сэкцыя, якая мае вызначаныя сродкі для стралковага спорту; сувязь з гэтай сэкцыяй нам прыдзецца наладзіць.

Нам неабходна больш узгадняць працу па ваенізацыі з профсаюзамі ад якіх у значнай меры залежыць праца нашых юнсэкцый.

Газэце «Чырвоная Зьмена» прыдзецца наладзіць вайсковы аддзел, які да гэтага часу быў з рук--вон кепскім.

САЮЗНЫЯ НАВІНЫ.

Твар нізавога актыву.

ЦК ЛКСМБ падвёў вынікі апошніх перавыбараў бюро ЛКСМБ.

Новы склад бюро ячэек мае цяпер такі выгляд: усяго сяброў бюро—**7896**, з якіх **хлапцоў**—6464 (81,9 проц.), **дзяўчат**—1432 (18,1 проц.).

Рабочых — 2304 (29,2 проц.), **батракоў**—431 (5,4 проц.), **беднякоў**—3054 (38,6 проц.), **серадтякоў**—1170 (14,9 проц.), **іншых**—937 (11,8 проц.).

Беларусаў—4814 (71,6 проц.), **яўрэяў**—1595 (23,7 проц.), **палякау**—103 (1,3 проц.), **вялікарусаў**—159 (1,5 проц.), **іншых**—53 (0,8 проц.).

Сяброў КПБ—359 (4,6 проц.), **кандыдатаў КПБ**—1084 (13,7 проц.), **не сяброў КПБ**—6453 (81,7 проц.).

ЦК адзначыў, што організацыя правяла значную падрыхтоўчую працу да перавыбараў.

У складзе бюро фабрычна-завадзкіх ячэек **павялічыўся процант сяброў партыі.** Значна ўзрос процант беларусаў.

У той час, як агульны лік дзяўчат у складзе бюро павялічыўся на 1 процант, ня выканана дырэктыва ЦК аб павялічэньні проценту дзяўчат у складзе сакратароў ячэек.

Калі будуць білеты?

Менскі акругком ЛКСМБ пастанавіў пачаць раздачу комсамольскіх білетаў пасьля праверкі організацыі ў раёнах і зьверкі ячэйковых сьпісаў з карткамі ў АК.

Райкомы павінны будуць прадставіць у АК сьпісы комсамольцаў, якія ня маюць комсамольскіх білетаў, пасьля чаго апошнія і будуць выдадзены.

Сход комсамольцаў-палякаў.

На 20-е лютага Менскім акругкомам ЛКСМБ склікаецца агульна-гарадзкі сход комсамольцаў-палякаў. На сходзе будуць разабраны пытаньні аб выніках нарады заходніх нацменшасьцяй і аб працы сярод польскай моладзі.

Рыхтуем карнавал.

Менакбюро ЮП сумесна з Ляхаўскім райбюро ЮП вядзе падрыхтоўку да правядзеньня вялікага карнавалу, прысьвечанага перавыбарам Гарсавету. Карнавал асьвяціць усю працу Менскага Гарсавету за год.

„Куток рабочага падростка“.

Пры Доме Санітарнай Асьветы організаваны «**куток рабочага падростка**», дзе будуць зьмешчаны розныя экспонаты і матар'ялы, характарызуючыя быт, працу і здароўе рабочай моладзі.

Меддапамога профшкольцам.

Да апошняга часу профтэхшкольцы гор. Менску ня мелі свайго спэцыяльнага ўрача.

Калегія наркамату аховы здароўя запрапанавала Менакрздраву тэрмінова вылучыць спэцыяльнага доктара, які будзе абслугоўваць усе Менскія профтэхшколы.

Наркампрацы даў дырэктыву ўсім інспэктарам аховы працы аб неабходнасьці паляпшэньня санітарна-гігіенічных умоў у профтэхшколах і школах ФЗВ.

Бронь ня зьніжаць!

Белдзяржкіно зьвярнулася ў Наркампрацы з хадайніцтвам аб зьніжэньні проценту броні падросткаў на кіно-прадпрыемствах з 10 да 5 проц. Хадайніцтва калегіяй Наркампрацы адхілена.

Краязнаўчы зьезд зачыніўся.

Пасьля 4-х дзён працы зачыніўся Усебеларускі краязнаўчы зьезд. У склад ЦБ краязнаўства абрана 50 чалавек, сярод якіх шмат прадстаўнікоў з месц.

На зьезьдзе прысутнічалі 182 дэлегаты.

У тры радкі.

▣ **На курсах кіно-мэханікаў** вучыцца 39 чалавек, пераважная частка якіх рабочая моладзь.

▣ **Юнсэкцыя Менскай біржы працы накіравала** ў працоўныя колектывы 25 перарасткаў-выхаванцаў дзетдамоў.

▣ **Галоўполітасьветы распрацаваў палажэньне аб сельска-гаспадарчых гурткох** на вёсцы і выдаў праграму іх заняткаў.

▣ У хуткім часе адбудзецца **лыжны прабег** паміж Гомелем і Рэчыцай.

▣ **150 паказальных вучасткаў** закладаецца вясной г. г. на сялянскіх палёх Гомельшчыны.


СКАЖЫ, ЯК ТУТ БЫЦЬ?

ПАКАЖЫ СВАЕ ВЕДЫ ВАЙСКОВАЙ СПРАВЫ!

ПРЭМІІ ЗА ЛЕПШАЕ РАШЭНЬНЕ ЗАДАЧ.

Ніжэй друкуюцца 3 задачы з вайсковай практыкі.—Рэдакцыя «Чырвонай Зьмены» абвяшчае конкурс на лепшае рашэньне гэтых задач. — Першыя тры верныя адказы будуць надрукованы ў газэце і за іх будуць выдадзены прэміі—«Чырвоная Зьмена» на 3 месяцы і зборнік «Парыская Комуна».—Гурткі вайсковых ведаў, ячэйкі ТСА, комсамольцы моладзь—прысылайце хутчэй адказы!

Плян мясцовасьці



Задача № 1.

Днём былі заўважаны пешыя выведнікі **супраціўніка** ў вёсцы **Серабранка**.

Ад **нашага** стралковага аддзяленьня, якое знаходзіцца ў вёсцы **Выселкі,** выстаўлен наглядальнік. Гэты наглядальнік стаіць на паўднёва-заходняй ваколіцы вёскі **Выселкі** каля дарогі.

Пад вечар, калі **яшчэ было сьветла,** наглядальнік заўважыў двух байцоў свайго аддзяленьня, якія зварочваліся з агляду наперадзе ляжачай мясцовасьці. Перад змрокам (сумеркамі) наглядальнік таксама заўважыў двух чалавек, якія набліжаліся па дарозе з боку супраціўніка. Гэтыя людзі былі адзеты, як мясцовыя жыхары і ня мелі вінтовак.

Трэба рашыць:

1. Ці будзе наглядальнік пытаць пропуск у першых двух байцоў—дазорных, якіх ён пазнаў у твар.

2. Ці прапусьціць наглядальнік 2-х чалавек у вопратцы мясцовых жыхароў, якія ідуць да нашага разьмяшчэньня.

3. Калі не прапусьціць, дык за колькі крокаў ён павінен іх спыніць?

4. Якім прыёмам наглядальнік будзе патрабаваць прыпынку—голасам ці знакам?

5. Як будзе дзейнічаць камандзір аддзяленьня, калі даведаецца аб зьяўленьні гэтых двух чалавек?

Задача № 2.

Камандзір ўзводу, маючы на ўвазе высылку выведкі, парашыў выйсьці да наглядальнага пункту з мэтаю азнаямленьня з мясцовасьцю.

Трэба рашыць:

1. Што камандзір бачыць каля будынкаў вёсак Серабранка і Выселкі?

2. Якой агародай абнесены вёскі Серабранка і Выселкі?

3. Які лес знаходзіцца к паўночы ад вёскі Серабранка—ігласты (хвойны) ці ліставы? Ці можна прайсьці па гэтаму лесу? Ці не зьяўляецца ён перашкодаю для вольнага руху?

4. Па якой мясцовасьці цячэ рака і ці няма якіх небудзь асаблівасьцяй у гэтай мясцовасьці, якія б палягчалі ці затрудняли рух на выведку?

5. У якім напрамку цячэ ручай (назавеце па краінам сьвету)?

Задача № 3.

Пры вывучэньні уласьцівасьцяй станковага кулямету «Максім» баец парашыў параўняць іх з уласьцівасьцямі вінтоўкі.

Трэба рашыць:

1. Які калібар маюць вінтоўка і кулямет?

2. Вага вінтоўкі і кулямёту?

3. Найвялікшы прыцэл?

4. Найвялікшая дальнасьць палёту кулі?

5. Лік выстралаў у хвіліну?

6. На колькі патронаў стужка кулямёту мае больш патронаў, чым абойма?

(На ўсе гэтыя пытаньні даць адказы ў мэтрычных мерах, акрамя пытаньня аб прыцэле).



На лепшага стралка.

27-га лютага г. г. Менакругком ЛКСМБ сумесна з АСФК праводзіць стралковыя спаборніцтвы на лепшага стралка-комсамольца.

Спаборніцтвы адбудуцца ў ціры пры дому Чырвонай арміі.

Удзел прымуць больш 40 чалавек. Занятым першыя 3 месцы будуць выдадзены прызы.







ПАБАЧЫЦЬ МЕНСК!

У нядзелю 13 лютага ў Менск прыехала 20 вучняў Вільшчынскай ШСМ на экскурсію, організаваную „Чырвонай Зьменай“.—Ніжэй друкуем нарыс удзельніка гэтай экскурсіі, які яскрава адбівае ўражаньні вучняў.

У 5 гадзіны ночы нас падняли. Праз некальк хвілін усе вучні былі на нагах.

— Усе тут?

— Усе!

— Ну, дык ідзем, а то спозьнімся да цягніка...

Мы рухнуліся доўгаю стужкай па шырокай дарозе. Хрупкі сьнег скрыпеў пад ботамі.

— Ты быў калі небудзь у Менску?

— Што у Менску? Ты запытайся ў мяне, ці я на цягніку ехаў!...

— Ах, каб ты скіс, што-ж ты за чалавек, калі на цягніку ня ехаў...

— Ха-ха-ха..,

Гукі сьмеху дрыжэлі ў начной цішы.

* * *

... Цягнік крануўся з месца. Запелі колы, задрыжэлі вокны. Ніяк не сядзіцца, усё думаецца аб Менску. Мабыць вельмі цікава ў нашай сталіцы!

Але вось вагоны пашлі ўсё цішэй і цішэй і хутка сталі.

— Выходзь хлопцы! Ужо мы ў Менску!

Усе паскакалі з вагону.

— Вы адкуль, хлапцы?—запытаўся ў нас нейкі хлапец у скураной куртцы.

— З Вільшчынскай школы сялянскай моладзі!—ледзь ні ў адзін голас адказалі мы.

— Я вас прышоў сустрэць. Хадзем за мною!

Гэта быў прадстаўнік «Чырвонай Зьмены».

Вясёлай гурбою мы пашлі па шырокай вуліцы. Вочы разьбягаліся — мы ня ведалі на што раней глядзець,

— Вось дом—дык дом! Глядзі, брат, якая гаргара!...

Праз кароткі час мы апынуліся перад чырвонымі варотамі, на якіх было напісана: «Музэй Рэволюцыі». Увашлі ў прыгожы будынак і нас павялі па сьветлых пакоях. Мы з цікавасьцю разглядалі розныя портрэты рэволюцыянэраў, гістарычныя дакуманты, кніжкі, дыяграмы і іншыя цікавыя рэчы. Пра ўсе гэта нам апавядаў групавод. Такім чынам мы за якую небудзь гадзіну пазнаёміліся з гісторыяй рэволюцыйнага руху, пачынаючы





ад першых сялянскіх бунтаў і канчаючы Кастрычнікавай рэволюцыяй. Асабліва зацікавіў хлапцоў аддзел рэволюцыйнага руху ў Беларусі.

Аглядзелі ўсё, ужо пара ісьці, але ніяк ня хочацца... Здаецца, цалы-б дзень глядзелі! Але трэба яшчэ пабачыць і іншае.

У Дзяржаўным Музэі мы таксама ўважліва азнаёміліся з усімі аддзеламі. Запомніліся 2 вялізарных мядзьведзі, якія сталі каля дзьвярэй...

— Цяпер такія ў лясох ня водзяцца...

Цікавіліся хлопцы вайсковым адзеньнем з жалеза, ключамі старасьвецкіх замкаў і іншымі рэчамі.

А вечарам пашлі ў Дзяржаўны Тэатр глядзець п'есу «**Каваль ваявода**».

Адразу кінулася ў вочы вялікая заслона, на якой былі намалеваны вёска, на якой былі намалеваны пазалочаныя саўны панскага ганку, а за ім блакітнае спакойнае возера... Гукі оркэстру разьнесьліся па тэатру. На сцэне захадзілі людзі, загаварылі... Дзіўна, дзіўна!... Усе мы былі ў захапленьні.

З тэатру мы вышлі ў 12 гадзін ночы.

Пераначавалі ў Доме Селяніна, а раніцою, ледзь сьвітала, паехалі назад у сваю вёску.

Янка Нэйч.

НА ЭКРАНЕ.

І яшчэ якім комам

(Аб фільму «Простытутка»).

Белдзяржкіно выпусьціла першы н... цыянальны фільм «**Лясная Быль**». Не... га сказаць, што «першы блін быў комам». Праўда, у гэтай фільме было шмат ... дахопаў», але ў асноўным яна бы... блізкая, родная і зразумелая для рабо... сялянскіх мас нашай рэспублікі.

Ня тое можна сказаць пра другі, «... цыянальны», з дазваленьня сказа... фільм «**Простытутка**». Памылілася с... рая пагаворка! **Ня першы, а др... блін комам!**

і яшчэ якім комам!

Напершае мы наогул зьдзіўлены, ... гэта называецца вытворчасьцю Белдзя... кіно. Правільней было-б сказаць: ра... скі фільм на беларускія грошы. Хай ... ня лаюць, што мы шовіністыя. «Ба... божа!» Мы толькі думаем, што калі к... організацыі бяруцца за стварэньне на... яянальных фільмаў—яны павінны гэ... задачу выконваць, як належыць.

У «Простытутцы» няма нават ніво... га намеку на Беларусь. Маскоўскія вулі... маскоўскія шыльды, маскоўскі рына... наогул усё маскоўскае! Гэта вельмі до... што Белдзяржкіно паклапацілася ве... адбіць маскоўскі быт, але, тавары... трэба было хоць хвілінку падумаць і... Беларусі і аб нашых гарадох... Утвараць «сухотныя» сродкі новыя фільмы Масквы—гэта ва ўсякім выпадку ні... ўсякай крытыкі.

Але паглядзім на фільм з другога бо... Ці мае ён тую мастацкую і навуковую к... тоўнасьць, аб якой так старанна зьві... ла Белдзяржкіно на ўсіх перакрэстках...

— Не!

Кідаецца ў вочы салодзенькая ідэа... зацыя, якой прапітана ўся стужка.

З другога боку дактары і дактары... вельмі філантрапічна настроены, ад... зу-ж ідуць насустрач «беднай» простыт... цы, мігам устрайваюць на працу і г... і г. д.

Вялікае соцыяльнае пытаньне змаз...

Не паказана тое, што трэба бы... паказаць.

Дзе сапраўдная барацьба з гэ... соцыяльным злом? Дзе небясьпека ... ражэньня. Чаму так мала асьв... лена праца нашых вэндыспансэраў. У... гэтага амаль **няма.**

У стужцы дадзены лічбы, характа... зуючыя ўзрост простытуцыі, соцыял... склад простытутак і г. д. Здаецца, **тут напэўна магчыма б ы... скарыстаць нашы беларуск... лічбы.** Дык не! Дадзены лічбы мас... скага дыспансэру, які **нехарактэр...** для БССР.

Некалькі слоў аб дробязях.

У фільме паказаны комсамолец Ал... які зьяўляецца «благородным спасител... простытуткі Любкі. Нам здаецца, што ... ты комсамолец пададзены некалькі ф... шыва. Комсамолец—дык абавязкова ... трэт Маркса на сьцяне, кніжка, чупр... і «остальные принадлежности». Мы ... хочам сказаць, што ў нашых комсам... цаў няма портрэтаў Маркса на сьц... але ў стужцы гэта выходзіць вельмі ... думана, нерэяльна. Рэжысэр, напэ... хацеў даць добрадзейны «амэрыканскі ... нец», але гэта вышла няўдала.

Нельга ўмаўчаць і пра такі ф... што чамусьці ўсе мужчыны ў філ... страшэнна ўродлівыя... Гэта вельмі д... ўтварыць брыдкае ўражаньне на гле... адным паказам такіх мужчын. Трэба ... ло так зрабіць, каб глядач адвярнуўс... такога мужчыны не таму, што ён у... лівы, а таму, што ён карыстаецца ... стытуткай.

Напэўна Белдзяржкіно, выпуска... „**Простытутку**“ на наш экран, ... на ўвазе толькі комэрцыйны раз... Інакш нельга тлумачыць зьяўленьне г... га «нацыянальнага» фільму.

Мы лічым, што разьлік Белдзярж... быў няўдалы...

Лепей было-б замест гэтага ствар... фільм, асьвятляючы **гэроічную ... рацьбу Ленінскага Комсам... Беларусі.** Тут можна было-б знай... шмат прыгожых і цікавых момант... можам упэўніць Белдзяржкіно, што ... камэрцыйных адносінах тут-бы не па... ліліся!

Б. Брадоц...
М. Гольдб...
Іл. Бараш...

20-га лютага ў клюбе імя КІМ п... наецца масавы **шахматны турнір ... ладзі.**

27-га лютага ў клюбе пачынаецца ... **савы шашачны турнір моладзі.**

Запіс на гэтыя турніры што... ў клюбе.

Пераможцам турніраў будуць выда... ны прызы.

Адказныя рэдактары **А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.**

Галоўлітбел № 23992 2 Дзяржрукарня БДВ.